ГОМЕЛЬСКАЯ ОБЛАСТЬ
Государственное учреждение образования
«Средняя школа № 9 г. Жлобина»

ГОМЕЛЬСКАЯ ВОБЛАСЦЬ
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Сярэдняя школа № 9 г. Жлобіна»

Материалы республиканского конкурса творческих работ
«Радзімы спадчына – мой гонар»

Номинация «Скарбніца традыцый маіх дзядоў»

# Древний обряд «Юрье»

Матэрыялы рэспубліканскага конкурсу творчых работ
«Радзімы спадчына – мой гонар»

Намінацыя «Скарбніца традыцый маіх дзядоў»

# Старажытны абрад “Юр’я”

Шикалова Диана Дмитриевна,
учащаяся 9 «Б» класса,
государственного учреждения
образования «Средняя школа № 9
г. Жлобина»
Садилова Наталья Николаевна,
учитель музыки
+375 (29) 105-04-45

Шыкалава Дыяна Дзмітрыеўна,
вучаніца 9 “Б” класа,
дзяржаўнай установы
адукацыі “Сярэдняя школа № 9
г. Жлобіна”
Садзілава Наталля Мікалаеўна,
настаўнік музыкі
+375 (29) 105-04-45

**Змест**


| | |
|---|---|
| Анатацыя | 3 |
| Глава І. Каляндарна-земляробчае свята “Юр’я” | 5 |
| 1.1. Фарміраванне міфалогіі беларусаў | 5 |
| 1.2. Гісторыя паходжання назвы свята “Юр’я” | 6 |
| 1.3. Агульнаэтнічны малюнак свята | 7 |
| 1.4. Музычная своеасаблівасць юраўскіх песень | 9 |
| Глава ІІ. Абрад “Юраўскі карагод” | 10 |
| 2.1. Галоўныя атрыбуты свята | 10 |
| 2.2. Абход нівы | 11 |
| Заключэнне | 12 |
| Літаратура | 13 |
| Дадатак 1 | 14 |
| Дадатак 2 | 15 |
| Дадатак 3 | 16 |
| Дадатак 4 | 17 |
| Дадатак 5 | 18 |
| Дадатак 6 | 19 |
| Дадатак 7 | 20 |
| Дадатак 8 | 21 |
| Дадатак 9 | 22 |

## Анатацыя


Сярод духоўных набыткаў беларускага народа асаблівую навуковую і культурную каштоўнасць мае фальклор. Гэта мастацкі летапіс народа, захавальнік яго багацейшых духоўных традыцый, быту і гаспадарчага вопыту, абуджальнік творчых здольнасцей беларусаў.

Беларускі народ вельмі працавіты, таленавіты, добразычлівы. Людзі маглі рабіць не толькі прыгожыя рэчы сваімі рукамі, але ўмелі добра адпачываць. У нашых продкаў было шмат свят, якія размяркоўваліся на працягу года і былі падпарадкаваны матэрыяльна-эканамічным інтарэсам сям'і. У святочныя дні людзі спявалі песні, танцавалі, вадзілі карагоды, рабілі тэатралізаваныя прадстаўленні.

У сярэдняй школе № 9 справе духоўнага і эстэтычнага выхавання дзяцей на аснове беларускага фальклору адводзіцца значная роля. Пачынаючы з 2018 года дзейнічае фальклорны калектыў "Валошкі", удзельнікам якога з'яўляецца аўтар гэтай творчай работы. Асноўная дзейнасць нашага калектыву – адраджэнне і рэканструкцыя каляндарна-земляробчых абрадаў Усходняга Палесся. У рэпертуары калектыву, сярод агульнавядомых народных свят, такіх як Каляды, Масленіца, Купалле, Вялікдзень ёсць і адметныя, якія атрымалі статус аб'ектаў нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь і прызнаны на міжнародным узроўні.

Каляндарна-земляробчыя святы і абрады беларусаў выразна падпарадкаваны гадавому вітку Зямлі вакол Сонца. Адпаведна народнаму светапогляду абрадава-святочны каляндар беларусаў пачынаецца вясной і заканчваецца зімой. Старажытную сонечную адпаведнасць святочнага календара беларусаў перш за ўсё сцвярджае багацце веснавых свят: Стрэчанне, Масленіца, Гуканне вясны, Саракі, Вялікдзень. Усе веснавыя абрады звязаны з працоўнай дзейнасцю чалавека, яго адвечнымі клопатамі аб ураджаі, дабрабыце сям'і, марамі і спадзяваннямі на лепшае будучае.

Але сапраўдны пачатак вясны ў каляндарна-земляробчай абраднасці быў звязаны са старажытным святам Юр'я, якое адзначалася 6 мая. Гэтае веснавое свята было напоўнена шматлікімі абрадавымі дзеяннямі, песнямі, павер'ямі, прыкметамі ахоўнага і заклінальнага характару.

Актуальнасць і выбар тэмы творчай работы вызначаны наступнымі фактарамі:

- па-першае, веды пра старажытнае свята Юр'я у нас, жыхароў горада, павярхоўныя і недакладныя;
- па-другое, вельмі важна вызначыць сутнасць і значэнне свята Юр'я ў сучасным свеце, неабходнасць захавання гэтай традыцыі, яе ролю ў духоўным жыцці беларусаў.

Таму мэта творчай работы – атрымаць навуковыя звесткі аб гісторыі паходжання і існавання старажытнага свята "Юр'я", вызначыць характэрныя спецыфічныя рысы гэтага абрада на Гомельшчыне.

Задачы:

- высветліць гісторыю паходжання назвы свята “Юр’я”;
- вызначыць агульнаэтнічны малюнак свята;
- акрэсліць музычныя асаблівасці юраўскіх песен;
- пазнаёміцца з асаблівасцямі правядзення абрада “Юр’я” на Гомельшчыне.

Аб’ектам вывучэння з’яўляецца традыцыйная культура беларускага народа. Прадметам вывучэння выступае старажытнае веснавое свята беларусаў – “Юр’я”. Тэарэтычнай асновай работы з’яўляецца навуковая літаратура, манаграфіі, відэа- і аўдыёматэрыял з архіва вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору БДУ імя Максіма Танка.

# Глава I

# Каляндарна-земляробчае свята “Юр’я”

## 1.1. Фарміраванне міфалогіі беларусаў

Чалавек часта сутыкаецца з такімі паняццямі, як “міф”, “міфалогія”. Імі абазначаюць нейкія з’явы, што лічацца неіснуючымі рэальна ці маюць адценне звышнатуральнасці. Усе народы свету маюць і захоўваюць як культурную спадчыну рэшткі язычніцкай міфалогіі. Для еўрапейцаў найбольш вядомымі з’яўляюцца міфалогіі старажытных грэкаў і рымлян, якія прызнаюцца класічнымі і вывучаюцца ў школах і ўніверсітэтах многіх еўрапейскіх краін.

Беларусы таксама маюць сваю язычніцкую міфалогію. Яна бярэ пачатак у IX-VIII-м тысячагоддзі да н. э., калі на тэрыторыі сучаснай Беларусі сфарміравалася пастаяннае насельніцтва і пачалося ўстойлівае існаванне першабытнага грамадства. Гэта быў час паляўнічых і збіральнікаў, які знайшоў адбітак у мысленні чалавека, адлюстраванні яго ўяўленняў пра свет. Прырода і жывёлы займалі значнае месца ў вобразнай карціне свету. Матэрыяльныя рэшткі першабытнай культуры на тэрыторыі Беларусі захоўваюць выявы людзей і жывёл, арнаментальныя ланцужкі. Археолагамі знойдзены ўпрыгожванні, якія ў той час выконвалі не эстэтычную, а магічную функцыю. У V-III-м тысячагоддзі да н.э. пачынаецца працэс пераходу да земляробства, а разам з гэтым адбываюцца значныя змены ў міфалогіі. На першае месца выходзіць шанаванне раслін, зямлі, сонца, дажджу і звязаных з ім навальніц і маланак. Навукоўцы лічаць, што ў гэты час фарміруюцца асноўныя аграрныя культы беларусаў [3, с. 15, 16].

Міфалагічныя ўяўленні знайшлі сваё адлюстраванне ў першабытным мастацтве. На посудзе ў арнаменце намаляваны сімвалы сонца – крыжападобныя фігуры, адзінарныя або двайныя кругі, шматпрамянёвыя выявы.

Паступова сацыяльнае жыццё грамадства ўскладняецца, што аказвае значны ўплыў на сферу міфалагічных уяўленняў. З VIII ст. да н.э. да VI ст. н.э. у асноўным сфарміраваўся пантэон багоў. Па нешматлікіх пісьмовых звестках вядома, што Сварог быў богам неба, а бог сонца Дажбог – яго сынам, Пярун быў богам грому і маланкі, Стрыбог – богам паветра, а Ярыла – богам урадлівасці і апекуном дзікай жывёлы, шматлікіх духаў мелі лясы і палі, рэкі і азёры, гаспадарчыя пабудовы [Д 1].

У канцы X ст. завяршаецца развіццё язычніцкай міфалогіі беларусаў і адбываецца хуткі пераход да хрысціянства з яго міфалагічнай сістэмай. Спынілася развіццё язычніцкай міфалогіі, але яна знікла не адразу. Працэс яе замены хрысціянствам расцягнуўся на доўгія стагоддзі [3, с. 17, 19]. Увядзенне хрысціянства не скасавала цалкам язычніцкіх уяўленняў. Хрысціянская царква вымушана была дапасоўваць свае святы і абрады да язычніцкага святочнага календара [6, с. 553].

Язычніцкія міфы і міфалагічныя персанажы ўвайшлі ў многія жанры беларускага фальклору. Чарадзейныя казкі зберагаюць тэмы і сюжэты язычніцкіх міфаў. Замовы маюць магічныя формулы язычніцтва, нават калі ў пачатку і ў канцы яны ўтрымліваюць хрысціянскія элементы. Прыказкі і прымаўкі не абыходзяцца без імёнаў язычніцкіх багоў і духаў. Этнаграфічныя матэрыялы дазваляюць аднавіць многія элементы беларускай міфалогіі. Найбольш значную інфармацыю даюць каляндарна-земляробчыя абрады [3, с. 30].

**1.2. Гісторыя паходжання назвы свята “Юр’я”**

“*На годзе ёсць два Юр’і, ды абодва дурні: увясну – галодны (6 мая), а зімой – халодны (9 снежня)*”, – гавораць у народзе пра адно з цікавых свят у беларускім народным календары [4, с. 83]. Перагукваецца зімовы Юр’я са сваім веснавым святам (“*галодным*”) у народнай прыкмеце: “*Колькі на зімовага Юр’я снегу, столькі на вясенняга – травы*” [2, с. 574]. Аднак, адкуль пайшла гэта назва – Юр’я? Што з’явілася асновай для ўзнікнення свята?

Вясна, у параўнанні з іншымі порамі года, найбольш багата абрадамі, звычаямі, рытуаламі, якія звязаны з працоўнай дзейнасцю чалавека, яго адвечнымі клопатамі аб сяўбе, росце збажыны, дабрабыце сям’і, марамі і спадзяваннямі на лепшае будучае. Як мы адзначылі раней, у язычніцкай славянскай міфалогіі богам вясенняй урадлівасці быў бог Ярыла. Слова “*Ярыла*” паходзіць ад славянскага *jara* – “*вясна*”. З Ярылай звязаны словы: яравыя (*веснавыя пасевы*), ярыца (*пшанічнае поле*) і інш. [2, с. 579]. У беларускай міфалогіі гэты бог уяўляўся прыгожым хлопцам у белай вопратцы і на белым кані. На галаве ў яго вянок з веснавых кветак, у руках каласы, ногі босыя. Адным з веснавых дзён Ярыла з дазволу багоў адмыкае нябесную браму і на белым кані па сонечным промні з’язджае на зямлю, каб адчыніць яе. Ярыла едзе па засеяных нівах. Яго сустракаюць усе жыхары паселішчаў. У людзей на галовах вянкі з кветак. Старыя кіруюць карагодам, які спявае песні ў гонар бога [Д 2]. З Ярылавага дня пачынаецца сапраўдная вясна. У гэты дзень упершыню выганяюць скаціну ў поле. Ярыла сам едзе на белым кані і ахоўвае жывёлу [3, с. 47].

У вядомага этнографа XIX стагоддзя П. Шпілеўскага захавалася апісанне беларускага свята ў гонар Ярылы, якое адзначалася ў канцы красавіка. Выбіралі дзяўчыну і апраналі яе ў белае адзенне Ярылы, на галаву адзявалі вянок з кветак і садзілі на белага каня. Вакол іх дзяўчаты ў вянках вадзілі карагод і спявалі песні пра Ярылу, як апекуна ўрадлівасці (“*Валачыўся Ярыла па ўсяму свету. Полю жыта радзіў, людзям дзеці пладзіў…*”) [2, с. 578].

У хрысціянскую эпоху функцыі такога язычніцкага бога як Ярыла былі нададзены святому Георгію (Юрыю) Пераможцу. Гэта адзін з найбольш значных святых у хрысціянстве. У яго гонар ўзводзілі храмы і цэрквы, стваралі іконы [Д 3], [Д 4].

Як сведчаць шматлікія легенды, Георгій нарадзіўся ў канцы III ст. н.э. на тэрыторыі Рымскай імперыі ў сям'і хрысціяніна. Ён быў воінам і займаў даволі высокі чын у войску імператара. Аднак у тыя часы адбывалася ганенне хрысціян. Георгій пакінуў вайсковую службу і стаў прапаведнікам хрысціянства. За што быў пакараны, і пасля цяжкіх пакут яму адсеклі галаву.

23 апреля (6 мая) адзначаецца хрысціянскае царкоўнае свята – Дзень Святога Георгія (Юрыя). Менавіта ў гэты дзень, паводле кананічнага жыцця, загінуў святы пакутнік.

Існуе шмат розных легенд пра жыццё, учынкі і цуды святога Георгія. Адна з іх апавядае пра перамогу над змеем. Паводле легенды, непадалёк ад горада Бейрута (сталіцы сучаснага Лівана) знаходзілася возера, у якім жыў велізарны змей-людаед. Жыхары горада былі язычнікамі і кожны дзень прыходзілі да пачвары, прыносілі ў ахвяру сваіх дзяцей.

Дайшла чарга і да адзінай царскай дачкі. Яе адвялі на бераг возера і пакінулі там. Яна стала чакаць, калі з вады выпаўзе змей і забярэ яе. Але тут перад ёй з'явіўся святы Георгій на кані і ўсадзіў дзіду ў змея. Потым ён загадаў дзяўчыне накінуць свой пояс на шыю пачвары і весці за сабой. Пасля гэтага святы Георгій адолеў змея на гарадской плошчы пры вялікай колькасці народа, і ўсе жыхары горада з таго дня паверылі ў Хрыста і прынялі хрышчэнне. На месцы забойства пачвары пабудавалі храм у гонар святога велікамучаніка Георгія, якога з гэтага часу сталі клікаць Пераможцам [7]. Традыцыйна святога Георгія хрысціяне лічаць заступнікам земляробаў, свойскай жывёлы і сялянскай нівы, пастухоў, воінаў і падарожнікаў.

Як бачым, назва старажытнага свята Юр'я з'явілася пасля прыняцця хрысціянства. Абрад прынята адзначаць 6 мая, ў гонар святога, які ўвабраў у сябе рысы як хрысціянскага пакутніка, так і язычніцкага бога Ярылы, і мае блізкае па гучанні імя. Белы колер адзення Ярылы атаясамліваецца з белым адзеннем Бога ці святога Юр'я [2, с. 579].

### 1.3. Агульнаэтнічны малюнак свята

З прыходам цёплых дзён абуджаецца і ажывае прырода, якая з'яўляецца носьбітам спадзяванняў селяніна на добры ўраджай. Веснавое свята Юр'я было звязана з сапраўдным пачаткам вясны. Менавіта з гэтага дня, як лічылі амаль усюды, пачынае куваць зязюля. На Юр'я сяляне выходзілі з песнямі і ахвярнымі стравамі аглядаць свае зарунелыя палеткі ("*Калі прыйдзе Юры, не ўзгледзіш у жыце куры*"). З Юр'ем звязваўся і першы выпас жывёлы (запасаў корму для яе павінна было хапіць як мінімум да гэтага дня – "*На Юр'я каб сена было і ў дурня*").

Добры гаспадар не прапускаў без увагі стан надвор'я і рабіў для сябе пэўныя высновы: "*Калі на Юр'я мароз – будзе добры авёс*". Снег на Юр'я надаваў надзеі, што ўлетку будзе добры ўраджай грэчкі, і наадварот – "*Як на Юр'я пагода – то на грэчку няўрода*". Густы юр'еўскі дождж упэўніваў селяніна, што вырасце густое вялікае жыта. Жыватворная юр'еўская раса таксама абяцала прыбытак: "*Як на Юр'я раса – хопіць коням аўса*".

Адначасова з апякунствам свойскай жывёлы Юр’я лічыўся валадаром ваўкоў. У народзе ўяўлялі, што Юр’я едзе на *белым кані* і замыкае пашчы дзікім звярам, пасля чаго тыя менш нападаюць на скаціну. Статак стараліся выганяць раніцай, на цудадзейную расу, якая павінна была забяспечыць вялікі дастатак малака. Перад выганам жывёлы гаспадар тройчы абыходзіў яе з запаленай грамнічнай свечкай і апрыскваў асвечанаю вадою. Абкурвалі жывёлу падпаленымі купальскімі зёлкамі, што захоўваліся ў кожнай хаце. Выганялі скаціну з хлява, падсцёбваючы асвечанымі на Вербніцу галінкамі вярбы, пры гэтым гаварылі: “*Бі-бі, ветачка, каб кароўка хадзіла! Бі-бі, ветачка, каб малака багата давала!*” Потым вербачкі ўторквалі ў хляве ад злых духаў. На парозе хлява перад жывёлаю клалі розныя сімвалічныя рэчы-абярэгі: яйка – каб каровы былі круглыя і поўныя; замкнуты замок – як ахоўны сродак ад ваўкоў (“*Няхай так замкнецца яго пашча на ўсё лета*”); ніты ад кроснаў – ад укусу змяі (“*Як гадзюка ніта не разбярэ, так ад кароўкі малака не адбярэ*”); пояс ці жменю выцягнутай са страхі саломы – каб скацінка трымалася свайго дома.

Першы выган жывёлы станавіўся і святам пастухоў – для іх гаспадары рыхтавалі добрыя закускі, а тыя на пашы ладзілі сабе пачастунак. Меў ён абрадавае значэнне. Пастухі гатавалі яешню і з ёю тройчы абходзілі статак, каб засцерагчы яго ад упаду і мору. У першы дзень пастухі не бралі з сабою нажа, бо вастрыць яго, першы раз гонячы статак, значыла б вастрыць воўку зубы.

Не забываў селянін у гэты дзень і пра сваю ніву. Ён выходзіў на яе з загорнутым у абрус караваем – увасабленнем леташняга ўраджаю – і абыходзіў палеткі, потым клаў хлеб у рунь, і калі ён хаваўся ў жыце, казалі, што яно сёлета будзе ўдалае. Вярнуўшыся дахаты, дзялілі каравай, спажывалі за святочным сталом. Асвячоная вербачка ўторквалася ў зямлю з вераю, што гэтым самым удасца абараніць ніву ад граду. На полі частаваліся, спявалі юраўскія песні:

Юр’е Бога клікала: да падай, Божа, ключыкі,
Адмыкнуць зямліцу, да выпусціць травіцу,
Да на травіцу расіцу, да на буйна жыта,
Да на цёпла лета, да на волікі ярмачко,
Да на кароўкі малачко [2, с. 573-574].

Значная частка юраўскіх абходаў палеткаў звязваецца з расой. У юраўскіх песнях захавалася вера нашых продкаў у ачышчальную сілу Юр’евай расы, якая нібыта даруе здароўе чалавеку і жывёле, спрыяе дзяўчатам у каханні:

Першы святок – святы Юр’я.
Святы Юр’я ўперад пайшоў,
Асядлаў каня варанога
І паехаў аж да Бога.
Узяў ключы залатыя,
Адамкнуў зямлю, пусціў расу.

Пусціў расу на ўсю вясну,
Вільготную, выгодную.
Пусціў расу цяплюсенькую
На гэты свет, на ўсякі цвет,
На люд вясёлы, на ўраджай.

Такім чынам, важнейшыя жыццёвыя функцыі, якія даручаюцца Юрыю, – “*адамкнуць зямліцу, выпусціць расіцу*”. “*Ён па межах ходзіць – жыта родзіць, па лужку ходзіць – каней, кароў, бычкоў, цялятак пасвіць, ад ліхадзеяў замаўляе*”. Таму зразумела, чаму у святочнай культуры беларусаў ён называецца “*першым святкам*” [4, с. 86, 87].

**1.4. Музычная своеасаблівасць юраўскіх песень**

Сярод музычных асаблівасцей веснавых песень вылучаецца няўстойлівая пабудова, адсутнасць дакладнага рытму, тэмпавыя адхіленні, пераменнасць метра і інш. Таму многія юраўскія песні выконваюцца без інструментальнага суправаджэння [1, с. 115]. Юраўскія песні вельмі разнастайныя па зместу і форме. І ўсё ж галоўная думка гэтых песень прасочваецца даволі выразна – гуканне вясны, адмыканне зямлі. Пры гэтым важна падкрэсліць, што Юр’я малюецца ў песнях не як святы, а выступае падобна простаму селяніну, галоўным клопатам якога з’яўляюцца звычайныя сялянскія справы:

Юрай, уставай рана, умыйся бела, прычашыся,
Прыбярыся, і кладзі боты,
Надзявай сукню, ідзі ў стайню,
Запрагай каня, бяры ключы да едзь у поле,
Адмыкай зямліцу, выпускай расіцу [5, с. 219].

Юраўскія песні співаюцца ўнісонна (аднагалосна), што з’яўляецца вядучай манерай пры харавым выкананні традыцыйных песень. Багатая мелодыка гэтых твораў пры іх выкананні патрабуе шырокай канцілены, пэўнай тэхнічнай падрыхтоўкі спевакоў. Асобную групу юраўскіх песень складаюць карагодныя. Ім уласцівы імправізацыйнасць, рухомасць, непасрэднасць [1, с. 114]. У карагодных песнях галоўная ўвага надаецца выкананню мелодыі: павольны тэмп, шырокая распеўнасць. Рухі выканаўцаў, як правіла, простыя (звычайны крок, крок з рухам у бок, “пераменны крок”, малюнкі нескладаныя – кола, кола ў коле (з рухам у розныя бакі) [6 с. 248].

# Глава II

# Абрад “Юраўскі карагод”

## 2.1. Галоўныя атрыбуты свята

Самая выразная адметнасць усходнепалескага Юр’я – непаўторны і самабытны веснавы абрад “Юраўскі карагод” вёскі Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. У Пагосце з 1980 года існуе фальклорна-этнаграфічны калектыў "Міжрэчча", створаны народнай пявунняй, краязнаўцам, захавальнікам традыцый сваёй вёскі Кацярынай Панчэняй. Гэты абрад у 2005 годзе атрымаў статус аб’ектаў нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь і адзін з першых уваўшоў у спіс культурнай спадчыны ЮНЕСКА.

Шматлікія дзеянні “Юраўскага карагода” разгортваюцца вакол хлеба-каравая, які мае назву “*карагод*”. Слова “*карагод*” (ці "*каравод*" у некаторых беларускіх гаворках) складаецца з двух частак: *карв* (*бык*) і *вадзіць*. “*Карв*” ці *бык* – ахвярная жывёла, якую ў дахрысціянскія часы славяне прыносілі ў дар богу сонца Ярыле. Паступова, пад уплывам хрысціянскіх вераванняў, абрад змяніўся.

Рыхтуюцца да свята загадзя. Напярэдадні сяляне наводзяць парадак у хатах і падворках, плятуць вянкі. Усе дзеянні абрада маюць сакральны сэнс і накіраваны  на зварот да Бога з просьбай аб добрым ураджаі. Галоўны атрыбут свята “*хлеб-карагод*” упрыгожваецца трыма галінкамі плодных дрэў (яблыні, слівы), а на кожнай галінцы павінна быць па тры парасткі – каб усяго было дзевяць. Столькі месяцаў працягваецца цяжарнасць жанчыны.

Так гэтым абрадам ушаноўваецца ўрадлівасць зямлі. Дзяўчаты абкручваюць цестам галінкі і саджаюць у печ, каб яно запяклося, пасля чаго ўпрыгожваюць птушачкамі з цеста і рознакаляровымі стужкамі [Д 5]. Дзеянні суправаджаюцца мелагучнай песняй:

Карагод, карагод, мы цябе наражаем,
Ой, венцы, венцы, зялёны бервенцы.
Цябе наражаем, Бога праслаўляем,
Бога праслаўляем, Юр’я велічаем,
Радзі, Божа, жыта, на новае лета,
Жыто і пшаніцу і ўсяку пашніцу.

Упрыгожаны каравай ставяць на пакрытае надзежнікам века ад дзежкі, на якое насыпана зерне жыта, абвязваюць чырвонай хусткай ці стужкай і ў сярэдзіну ставяць запаленую свечку. Мужчыны не прымаюць удзел ў прыбіранні хлеба-каравая. Калі ўсё гатова, жанчыны і дзяўчаты клічуць прызначанага мужчыну – “*ваяводу*”, які і будзе насіць карагод, круціцца з ім па сонцу і падымаць яго высока пад словы песні.

Не менш цікавымі атрыбутамі з’яўляюцца сваеасаблівы сцяг – прымацаваны да грабель зялёны фартух і васьміканцовая калядная зорка, у сярэдзіне якой знаходзіцца вобраз Божай Маці. Гэтыя атрыбуты нясуць хлопцы.

Каб трапіць на поле, усе ўдзельнікі абраду павінны ісці ў пэўным парадку: спачатку дзве дзяўчыны, якія з ручніка ўтвараюць сімвалічныя вароты, як царскія вароты ў царкве, адкрытыя пасля Вялікадня, потым святар, хлопец з іконай Божай Маці, “*ваявода*” з карагодам, хлопец з зоркай, хлопец з граблямі, на якіх прычэплены зялёны фартух. За імі – шарэнгай жанчыны, дзяўчаты, потым хлопцы [Д 6]. Перад выхадам “*ваявода*” тры разы падымае ўгору карагод са словамі: “*З Богам*!” На поле ідуць моўчкі, не спяваюць.

### 2.2. Абход нівы

Асноўныя дзеянні адбываюцца на полі. Спачатку святар чытае малітву і асвячае поле, а потым усе заклікаюць святога Юр’я “*Адамкнуць зямліцу, выпусціць расіцу. Радзі, Божа, жыта на новае лета!*” Звяртаючыся да поля, кажуць: “*Мы прыйшлі на гэта поле, Бога папрасіць поле асвяціць, бо без Бога – не да парога. Каб ураджай быў вялікі і людзі былі здаровы*”. Адна з дзяўчат закопвае ў жыце кавалачак чорнага хлеба, перавязанага чырвонай стужачкай – дар, ахвяра зямлі.

На полі ўсе удзельнікі святочнага шэсця ўтвараюць кола, у цэнтры якога знаходзіцца мужчына з ўпрыгожаным караваем, хлопец з іконай, хлопец з каляднай зоркай. Сяляне спяваюць прыгожыя юраўскія песні, водзяць карагоды, якім надаецца магічнае значэнне:

Веду, веду карагод, усе дзевачкі напярод,
Хлопчыкі за намі, моргаючы бровамі.
А ў карагода сын ваявода,
А ў карамысле – добрыя мыслі.
Дзе карагод ходзіць – там жыта родзіць,
А дзе не бывае, там яно лягае”.

Падчас выканання карагоднай песні зялёны фартух, прымацаваны да грабель, мяняюць на чырвоны – сімвал плоднасці зямлі [Д 7].

Наступны этап свята – абход двароў. Ён суправаджаецца музыкай, рознымі песнямі, прыпеўкамі. Каля кожнага двара пасля атрымання дазволу спяваецца песня “Карагод, карагод“ ці “Дай, Юрай, маці ключы”, пасля чаго гаспадыні даюць яйкі цотнай колькасцю, каб дзяўчаты знайшлі сабе пару, а таксама пірагі – каб быў добры ўраджай. Лічыцца, што для гаспадароў той хаты, каля якой вадзілі карагод, наступны год будзе шчаслівы. Пасля абходу двароў усе збіраюцца ў цэнтры вёскі, абрадавы хлеб дзеліцца паміж прысутнымі. Сяляне водзяць карагоды: “Проса”, “Дрыма”, “Рэпка”, танцуюць танцы “Падыспань”, “На рэчаньку”, “Кракавяк”, “Карапет”.

Відавочна, Юраўскі карагод увасабляе агульную калектыўную сілу, якой надаецца здольнасць уплываць на ўрадлівасць, на будучы ўраджай [5, с. 217–220].

## Заключэнне

Мэту творчай работы мы лічым дасягнутай, пастаўленыя задачы выкананымі. Падчас вывучэння былі атрыманы навуковыя звесткі пра паходжанне веснавога абрада “Юр’я”, яго сувязь з міфалагічнымі і хрысціянскімі ўяўленнямі беларусаў. Мы даведаліся, што сярод агульнавядомых асаблівасцей свята вылучаюцца і рэгіянальныя, аб гэтым сведчыць непаўторны абрад “Юраўскі карагод” вёскі Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці.

Юр’е – адно з найбольш адметных свят земляробчага календара, якое напоўнена шэрагам урачыстых абрадавых дзеянняў, павер’ямі, прыкметамі заклінальнага характару. Сутнасць і значэнне веснавога свята Юр’я, як і іншых абрадаў, у тым, што старажытныя ўяўленні, вераванні і гістарычныя факты з’яўляюцца невычэрпнай крыніцай ведаў аб мінулых часах, гісторыі роднага краю, жыцці нашых далёкіх продкаў. Гэта аснова духоўнай культуры беларускай нацыі. Бо дакладна вядома, што народ, які беззваротна губляе сваю мову, традыцыі – не мае будучыні. Кожны народ у свеце ганарыцца сваімі помнікамі, сваім фальклорам, сваёй музыкай або літаратурай. Ганарыцца народу належыць і сваім вялікім і невялікім укладаннем у культуру чалавецтва. Бо ў кожным укладанні любога народа ёсць нешта сваё, непаўторнае, а таму і асабліва каштоўнае.

У выніку работы можна зрабіць наступныя вывады: нягледзячы на тое, што язычніцкая міфалогія спыніла сваё развіццё і працэс яе замены хрысціянствам расцягнуўся на доўгія стагоддзі – яе асобныя элементы на бытавым і культурным узроўні функцыяніруюць і ў наш час.

На занятках па сцэнічнаму майстэрству ўдзельнікі калектыву “Валошкі” аднавілі непаўторны, самабытны веснавы абрад “Юраўскі карагод” [Д 8, Д 9]. Вельмі каштоўнымі для ўсіх вучняў сталі веды пра тое, што малая радзіма – Гомельшчына, мае багатую культурную спадчыну, цудоўныя фальклорныя традыцыі, а нашы продкі былі творчымі, таленавітымі людзьмі, здольнымі жыць у адзінстве з навакольным асяроддзем.

## Літаратура

1. Беларускі музычны фальклор / А.Аляхновіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1996. – 335 с.

2. Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік / С.Санько і інш. – Мінск: Беларусь, 2006. – 599 с.

3. Міфалогія старажытнай Беларусі / А.Шамак. – Мінск: Сэр-Віт, 2004. – 240 с.

4. Святы і абрады беларусаў / В.Ліцьвінка. – Мінск: Беларусь, 1997. – 176 с.

5. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Том 6. Гомельскае Палессе і Падняпроўе. Кніга 1 / Т.Валодзіна, Т.Варфаламеева, М.Козенка і інш. – Мінск: Вышэйшая школа, 2012. – 910 с.

6. Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя / І.Шамякін і інш. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 575 с.

7. https://stsl.ru/news/all/chudesa-svyatogo-georgiya-pobedonostsa

## Дадатак 1



Сварог



Дажбог



Пярун



Ярыла

**Дадатак 2**





Вобраз бога Ярылы ў славянскай міфалогіі

**Дадатак 3**



Ікона “Цуд Георгія аб зміе”, XV ст., 89 × 67 см.
Дзяржаўная Траццякоўская галерэя, г. Масква

## Дадатак 4



Царква святога вялікамучаніка Георгія Пераможцы г. Баранавічы Брэсцкай вобласці, 2010 год



Іканастас царквы святога вялікамучаніка Георгія Пераможцы г. Баранавічы Брэсцкай вобласці, 2010 год

**Дадатак 5**







“Хлеб-карагод” – галоўны атрыбут свята “Юр’я” у в. Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці

## Дадатак 6







Святочнае шэсце сялян в. Пагост на жытнёвае поле

**Дадатак 7**





Асноўныя дзеянні абрада “Юраўскі карагод” на полі

## Дадатак 8







## Дадатак 9

## Сцэнарый абрада “Юраўскі карагод”

### Вёска Пагост, Жыткавіцкі раён Гомельскай вобласці

*На сцэне з'яўляюцца некалькі дзяўчат, якія трымаюць галінкі яблыні. У адной з іх – каравай, у другой – ікона, трэццяя нясе века ад дзежкі з зернем, у чацвёртай – рушнік. Усе астатнія падыходзяць да іх.*

**Ганначка:** Вось і дачакаліся мы свята Юр'я! Збірайцеся, хлопцы, дзяўчаты сёння пойдзем ніву аглядаць.

**1 дзяўчына:** Мы ўставалі раненька, выпякалі, нараджалі абрадавы каравай. Вось які ён прыгожы, духмяны ў нас атрымаўся.

**Ганначка:** А дзе ж нашыя тры галінкі?

**2 дзяўчына** (*падае галінкі*)**:** Вось, Ганначка, тры галінкі ад яблыні.

**Ганначка:** Так, так, галінкі трэба браць толькі ад дрэў жаночага роду. А на кожнай галінцы павінна быць па тры парасткі – каб усяго было дзевяць. Столькі месяцаў працягваецца цяжарнасць жанчыны. Так гэтым абрадам ушаноўваецца ўрадлівасць зямлі. Ну што, дзяўчаты, давайце будзем упрыгожваць наш карагод. Бо без Бога не да парога! Каб Бог жыта ўрадзіў, ды пшаніцу, ячмень як мятліцу!

**2 дзяўчына:** Давайце, будзем упрыгожваць. Вось нашы каляровыя кветачкі і стужачкі.

(*упрыгожваюць папяровымі кветкамі тры галінкі. Усе дзяўчаты спяваюць песню*)

***“Карагодная”***

Карагод, карагод мы цябе наражаем,
Ой, венце, венце зелёнэ бервенце (2 раза).

Цябе наражаем, Бога праслаўляем.
Ой, венце, венце зелёнэ бервенце (2 раза).

Бога праслаўляем, Юр'я велічаем,
Ой, венце, венце зелёнэ бервенце (2 раза).

Чэша хлопец косы, а дзяўчына косу,
Ой, венце, венце зелёнэ бервенце (2 раза).

Пожану мы волы на Юр'евску росу,
Ой, венце, венце зелёнэ бервенце (2 раза).

**3 дзяўчына:** Вось які цудоўны наш карагод атрымаўся: высокі, прыгожы!

**4 дзяўчына:** А зараз возьмем века ад дзежкі (крышка ад бочкі), насыплем трошкі зерня жыта, накрыем посцілкай і паставім наш карагод. А дзе ж нашыя хлопцы? Без іх нельга ісці да поля!

*Падыходзяць хлопцы. Аднаму з іх дзяўчаты даюць ікону, у другога – граблі з зялёным фартухом.*

**Ганначка** (*звяртаецца да хлопца*): Бяры, ваявода, свайго карагода! Пойдзем у поле Бога прасіць, каб даў нам добры ўраджай! Ісці на поле будзем амаль моўчкі, спяваць не дазваляецца!

*Спускаюцца са сцэны, накіроўваюцца да поля. Спачатку ідуць дзве дзяўчыны, трымаюць рушнік, нібы браму. Потым ідзе хлопец з іконай, наступны хлопец нясе ўпрыгожаны карагод (каравай), яшчэ адзін хлопец нясе граблі (сімвал працы) з зялёным фартухом, потым – музыкант з гармонікам. За імі ідуць дзяўчыны. Падымаюцца на сцэну. Усе праходзяць праз сімвалічную браму, створаную з рушнікоў. Становяцца ў кола, пасярэдзіне стаяць хлопцы з іконай, з караваем, з граблямі і зялёным фартухом.*

**1 дзяўчына:** Вось і падышлі мы да поля. Добры дзень, ніва, маладая! З хлебам, з соллю да цябе прыйшлі!

**Ганначка:** Дай поклічам Святога Юр’я адмыкнуць зямліцу, выпусціць расіцу! Радзі, Божа, жыта на новае лета! Жыта і пшаніцу, і ячмень, як мятліцу! Божый дар – кавалачак чорнага хлеба *(перавязанага чырвонай стужачкай*) закапаем у святую зямлю, каб вярнуць нам ураджай. Просім усердна! Бо без Бога не да парога!

**2 дзяўчына:** Людзі кажуць “Калі прыйдзе Юры, не ўгледзіш у жыце куры!”

**3 дзяўчына:** Ой, пасею я загон, дай раз у год! Дайце мне севнюка такога, каб не старога, а маладога! Бо ў старога ў барадзе вошы, а ў маладога ў кармане грошы!

**4 дзяўчына:** А на Юр’е была баба дурнем. Напякла перапеч паўнюсеньку печ! Навыбірала дзевяць начовак і шастое сіта, каб зародзіў Бог жыта. Жыта і пшаніцу, да всякую пашніцу!

*Ідуць па ходу сонца, узяўшыся за рукі па колу, пасярэдзіне стаяць хлопцы з іконай, з караваем, з граблямі і зялёным фартухом. Усе спяваюць песню*:

Дай, Юрай, маці ключы, да падай маці ключы.
Яго небо отворыці, дай расіцу спусціці.

*Мяняюць фартушок на граблях з зялёнага на чырвоны.*

Ведом, ведом карагод, сам Бог напярод.
А ў карагода сын ваявода, а ў карамысле добрыя мыслі.

Дзе карагод ходзіць, там Бог жыта родзіць.
А дзе не бывае, там жыта лягае.

Зарадзі Божа, жыта да на новае лета.
Да на жыта караністае, а да верху каласістае.

**1 дзяўчына:** Святы Юр'я – божы угоднік, абарані нашу ніву ад усякіх напасцяў, ад граду, ад спёкі, каб не палягло, не выгарэла, каб расло, красавалася, буйным коласам налівалася.

**2 дзяўчына:** Святое Благавешчанне, святая Тройца, усе святыя, памажыце!

**3 дзяўчына:** Ісус Хрыстос, Багародзіца, выратуйце нас ад бяды, ад усякай хваробы!

**4 дзяўчына:** Станьце, Ангелы-ахоўнікі, сцяною ад нячыстай сілы, ліхіх людзей, чараўнікоў!

**5 дзяўчына:** Святы Юр'я, дай нам на жытачка род, на статачак – плод!

**6 дзяўчына:** Будзьце словы нашыя моцныя і магутныя!

**1 дзяўчына:** Папрасілі мы ў бога, каб было ў нас жыта многа. А зараз патанчым па расе, каб былі здаровыя ўсе.

Да Юрай маці ключы, да падай маці ключы.
Яго небо отворыці, дай росіцу спусціці.

Дзе карагод ўецца, там жыто смяецца,
А дзе не бывае, там жыта лягае.

Ведом, ведом карагод, усе дзевачкі напярод,
А хлопчыкі за намі моргаючы бровамі.

Зародзі Божэ, жыто да на новае лето.
Да на жыто, на пшаніцу, да на всякую пашніцу.

Да Юрай маці ключы, да падай маці ключы.
Яго небо отворыці, дай росіцу спусціці.

*З поля выходзяць зноў праз браму з рушніка у тым жа парадку. Спяваюць песню "Да Юрай маці ключы"*